ЛЮДЗІ ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУКІ



# Стаць гісторыкам было вызначана лёсам...

*Да 75-годдзя з дня нараджэння Пятра Ціханавіча ПЕТРЫКАВА*

**У** ліпені 2002 г. навуковая грамадскасць адзначыла 75 гадоў з дня нараджэння члена-карэспандэнта НАН Беларусі, прафесара, доктара гістарычных навук Пятра Ціханавіча Петрыкава. Калі сустракаешся з ім, цяжка паверыць у гэты ўзрост, настолькі поўны ён жыццёвых сіл і творчай энергіі. Патэнцыял ведаў, вопыту і прыроднага даравання вучонага яшчэ далёка не вычарпаны.

На долю людзей, што нарадзіліся ў мінулым стагоддзі, выпала нялёгкае жыццё: голад, войны, цяжкая праца з дзяцінства. Не абмінула ўсё гэта і 12 дзяцей сялянскай сям'і Ціхана і Аляксандры Петрыкавых з вёскі Мікалаеўка Добрушскага раёна, у якой 12 ліпеня 1927 г. адзінаццатым нарадзіўся сын Пётр. На жаль, двое з дзяцей памерлі ў маленстве.

Складаным быў лёс астатніх членаў гэтай вялікай і працавітай сям'і. Усе яны атрымалі прафесійную адукацыю, сямёра з іх — вышэйшую. Два браты — пагранічнік Аляксей і лётчык Іван — загінулі ў першыя дні вайны, Аляксандр, Васіль і Сяргей змагаліся на фронце, брат Міхаіл — у партызанскім атрадзе. Ім пашчасціла выжыць. Пасля вайны Васіль Ціханавіч працаваў намеснікам міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, а Сяргей Ціханавіч быў цяжка паранены, дэмабілізаваўся і працаваў настаўнікам.

У 1944 г. П.Петрыкаў быў прызваны ў Савецкую Армію і праслужыў амаль 7 гадоў. У хлопца была незвычайная прага да ведаў, і ён пасля дэмабілізацыі з арміі ў 1951 г. паступіў на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Ужо ў студэнцкім асяродку, паводле сведчанняў аднакурснікаў, ён вылучаўся сваімі навуковымі здольнасцямі, уменнем сістэматызаваць і аналізаваць гістарычныя факты. Праз пяць гадоў вучобы і напружанай працы ён абараняе дыпломную работу «Гістарычныя

погляды М.Г.Чарнышэўскага» і на «выдатна» заканчвае універсітэт.

У час вучобы ва універсітэце Пётр Ціханавіч сустрэў Антаніну Ярашэвіч. Яны звязалі свой лёс і разам выхавалі 3 дзяцей. Пасля заканчэння універсітэта ён па размеркаванню едзе ў в. Шацілкі Гомельскай вобласці, дзе працуе настаўнікам, потым намеснікам дырэктара сярэдняй школы. Сямейнае і прафесійнае жыццё ўладкавалася, але навука, да якой настаўнік толькі дакрануўся ў час вучобы ва універсітэце, моцна вабіць яго. У 1958 г. П.Петрыкаў паступае ў аспірантуру Інстытута гісторыі АН БССР. Крок гэты стаў вызначальным у яго жыцці, яно назаўсёды звязваецца з Акадэміяй навук. Вядома, навуковае даследаванне — творчы, стваральны працэс. Ён патрабаваў ад маладога навукоўца спецыяльных ведаў, мэтанакіраванасці, волі, энергіі, умення пераадольваць цяжкасці. Імкненне да ісціны — неад'емная патрэба кожнага даследчыка. Гэта было дамінантай і ў рабоце П.Петрыкава, хоць, безумоўна, на яго навуковую дзейнасць наклала адбітак і ідэалогія таго часу. У 1962 г. пад кіраўніцтвам прафесара І.І.Саладкова ён абараняе кандыдацкую дысертацыю. Праз адзінаццаць гадоў даследчык пераадольвае больш высокі рубеж — абараняе доктарскую дысертацыю на тэму «Советы депутатов трудящихся и их роль в создании материально-технической базы коммунизма (1959—1965 гг.)».

Навуковая і грамадская кар'ера складваецца паспяхова: малодшы навуковы супрацоўнік, вучоны сакратар, намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута гісторыі. У 1975 г. пасля двухгадовай працы сакратаром парткама Акадэміі навук БССР П.Петрыкаў прызначаецца дырэктарам Інстытута гісторыі АН БССР і працуе там да 1988 г.

П.Петрыкаў актыўна займаецца выкладчыцкай працай. У 1978 г. яго зацвярджаюць у вучоным званні прафесара. Пад кіраўніцтвам П.Петрыкава Інстытут гісторыі праводзіў даследаванні з улікам тагачасных задач развіцця гістарычнай навукі, некаторых новых яе напрамкаў, звязаных са стварэннем абагульняючых прац. Важную ролю ў асвятленні гісторыі Айчыны адыгралі 5-томная «Гісторыя Беларускай ССР», аднатомная «История БССР» (1977 г.), «История Полоцка» (1987 г.), 4-томная «История рабочего класса Белорусской ССР», вялася работа па напісанні 5-томнай гісторыі сялянства. Гэта найбольш значныя працы, якія былі падрыхтаваны пры ўдзеле П.Петрыкава. Ён таксама прымае ўдзел у стварэнні археалагічнага музея «Бярэсце», выступае на навуковых форумах у СССР, ЗША, Румыніі, Польшчы, Іспаніі, ГДР.

Калектыў Інстытута гісторыі ў гэты час пачаў шырокамаштабнае супрацоўніцтва з навуковымі ўстановамі Расійскай Федэрацыі, Літвы, Украіны, Малдовы, Польшчы. Вялася сумесная праца беларускіх, літоўскіх, польскіх, расійскіх вучоных над падрыхтоўкай да выдання Літоўскай метрыкі. Актыўна працаваў Пётр Ціханавіч у створаным у 1973 г. Міжрэспубліканскім каардынацыйным савеце па праблеме гістарычных сувязей беларускага, украінскага і малдаўскага народаў. Вынікам сумеснай працы стала серыя публікацый, у тым ліку кніг «Исторические корни дружбы и единения украинского и белорусского народов», «Нерушимая дружба украинского и белорусского народов в период социализма» (абедзве Кіеў, 1978). У 1984 г. група аўтараў і рэдактараў гэтых выданняў, у тым ліку П.Петрыкаў, была ўдастоена Дзяржаўнай прэміі Украінскай ССР.

Вучоны шырокага профілю, П.Петрыкаў узбагаціў беларускую гістарыяграфію арыгінальнымі даследаваннямі, якія атрымалі прызнанне ў Беларусі і СССР.

Ім напісаны манаграфіі «Организация и деятельность постоянных комиссий местных Советов Белоруссии. 1944—1970 гг.» (1971 г.), «Советы депутатов трудяшихся БССР и их роль в создании материально-технической базы коммунизма (1959—1965 гг.)» (1972 г.), «Революционные комитеты Белоруссии» (1975 г.), «Забота Советской власти о здоровье трудяшихся» (1976 г.). Шматлікія рэцэнзіі на кнігі даследчыка сцвярджаюць іх навуковую вартасць.

Як арганізатар навукі П.Петрыкаў шмат зрабіў для ўсталявання ў Інстытуце гісторыі АН БССР атмасферы творчага навуковага пошуку, адносін добразычлівасці і прафесіяналізму. Вялася актыўная падрыхтоўка маладых навуковых кадраў. П.Петрыкаў узначаліў першы, створаны ВАКам СССР у Беларусі

Спецыялізаваны савет па абароне дысертацый пры Інстытуце гісторыі, дзе за 10 гадоў былі абаронены 23 доктарскія і 114 кандыдацкіх дысертацый. Адначасова ён з'яўляўся членам экспертнага савета ВАК СССР. Пад кіраўніцтвам Пятра Ціханавіча было падрыхтавана больш за 20 кандыдатаў і 6 дактароў навук.

Навуковыя інтарэсы вучонага паступова схіляюцца ад пытанняў нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў бок гісторыі навукі, праблем гістарычнай навукі, вывучэнне якіх у той час, ды і сёння, многімі недаацэньваецца. У 1973 г. па рашэнню Прэзідыума АН БССР П.Петрыкаў стварае групу па напісанні гісторыі АН БССР, праз 7 гадоў яна была рэарганізавана ў аддзел гісторыі навукі, які Пётр Ціханавіч узначальваў з 1984 па 1990 г. Менавіта ў гэты час пад яго кіраўніцтвам складваецца беларуская навуковая школа гісторыкаў навукі. Сам вучоны даследуе гісторыю гістарычнай навукі. Разам з У.М.Міхнюком выдае працу «Историческая наука Белорусской ССР, 80-е годы» (1987 г.). За 12 гадоў існавання аддзела (скасаваны ў 1992 г. і адноўлены ў 1999 г.) яго супрацоўнікамі былі абаронены 7 кандыдацкіх і 2 доктарскія дысертацыі.

П.Петрыкаў — адзін са стваральнікаў музея гісторыі НАН Беларусі, з 1991 г. з'яўляецца яго дырэктарам. Адначасова з 1996 па 1999 г. працаваў першым намеснікам галоўнага рэдактара выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», а з 1999 г. ён галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

П.Петрыкаў як аўтар і рэдактар удзельнічаў у падрыхтоўцы фундаментальных прац — «Академия наук Белорусской ССР» (1979 г.), «Наука и техника Советской Белоруссии в 1917—1990 гг. Хроника важнейших событий» (1991 г.), «Национальная академия наук Беларуси (1929—1999)» (1998 г.), «Национальная академия наук Беларуси. Персональный состав. 1928—1998» (2 выданні, 1998 г., 1999 г.), з'яўляўся кіраўніком-каардынатарам комплекснай праграмы «Гісторыя навукі і культуры Беларусі (дасавецкі перыяд)». Паспяховае ажыццяўленне яе завяршылася выданнем буйной калектыўнай працы «Очерки истории науки и культуры Беларуси IX—начала XX в.» (1996 г.).

Цяпер пад кіраўніцтвам акадэміка М.А.Барысевіча Пётр Ціханавіч працуе намеснікам старшыні камісіі НАН Беларусі па гісторыі навукі, намаганнямі якой выйшла ў свет грунтоўная абагульняючая праца «Наука Беларуси в XX столетии» (2001 г.).

Усяго ж з-пад пяра П.Петрыкава выйшла больш за 160 прац, сярод якіх манаграфіі, зборнікі, брашуры, навуковыя дапаможнікі, артыкулы. Для ўсіх яго прац уласцівы творчы падыход пры асвятленні складаных тэм, скрупулёзнае вывучэнне і выкарыстанне архіўных крыніц.

Актыўны ўдзел прымаў і прымае юбіляр у грамадскім жыцці рэспублікі і Нацыянальнай Акадэміі навук. Ён выбіраўся дэпутатам Першамайскага раённага Савета г. Мінска, працаваў членам Дзяржаўнай камісіі па падрыхтоўцы падручнікаў у гуманітарнай сферы, лектарам таварыства «Веды». Хацелася б звярнуць увагу на некаторыя малавядомыя моманты грамадскай актыўнасці Пятра Ціханавіча. Так, акадэмік М.Барысевіч і ён былі першымі, хто ў канцы 1970-х гг. паставіў пытанне перад ЦК КПБ аб навуковай і палітычнай рэабілітацыі першага прэзідэнта АН БССР акадэміка У.М.Ігнатоўскага. У другой палове 1980-х гг. П.Петрыкаў шмат зрабіў, працуючы ў акадэмічнай камісіі па рэабілітацыі супрацоўнікаў акадэміі, якія былі рэпрэсіраваны ў 1930-я гг.

Як чалавек і вучоны, арганізатар навукі П.Петрыкаў карыстаецца заслужаным аўтарытэтам сярод тых, з кім працаваў. Яго імя шырока вядома ў нашай рэспубліцы і далёка за яе межамі.

Супрацоўнікі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, яго сябры, вучні, калектыў рэдакцыі «Беларускага гістарычнага часопіса» шчыра віншуюць Пятра Ціханавіча Петрыкава з 75-годдзем, жадаюць яму здароўя, бадзёрасці, добрага настрою, новых творчых поспехаў.

**Георгій Карзенка,**
*доктар гістарычных навук, загадчык аддзела гісторыі навукі Інстытута гісторыі НАН. Беларусі;*
**Ігар Шаўчук,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С.Пушкіна.*